*А. У. Жардзецкая (Беларусь)*

# МАСТАЦКАЕ АДЛЮСТРАВАННЕ ВАЙНЫ Ў ПАЭЗІІ ЯКУБА КОЛАСА 1941–1945 ГГ.

На трагічныя падзеі вайны Якуб Колас вельмі аператыўна адгукаўся вострым, палымяным публіцыстычным словам, прасякнутым пачуццём гневу і пагарды да ворага і верай у непазбежнасць перамогі над сіламі зла.

Большасць паэтычных твораў Коласа першых гадоў вайны ўяўляюць сабой вершы выразна грамадзянскай скіраванасці з адкрытым і пафасным выказваннем пачуццяў гневу і пагарды ў адносінах да акупантаў. Гэта вершы публіцыстычнага жанру з заклікальнай і лозунгава-прамоўніцкай інтанацыяй: «Шалёнага пса – на ланцуг!», «Фашысцкім бандытам», «На абарону», «Смерць разбойнікам», «Абаронцам роднай зямлі», «Народу-барацьбіту», «На звера», «Душою і сэрцам мы з вамі, героі» і інш.

Большасць вершаваных твораў 1941 г. маюць ярка выяўленае аптымістычнае гучанне: «К канцу падыходзіць дарога / Крыві і ярма. / Ад ярасці гневу людскога / Збавення няма» [1, с. 221]. У вершы «1942» пісьменнік канстатуе: «І я веру ўсёй душой – / Рухне сіла цьмы, / І высока над зямлёю / Сцяг падымем мы» [1, с. 207].

У многіх вершах Якуб Колас з вялікім болем гаворыць пра невымерныя пакуты безабаронных мірных жыхароў, хаты якіх спалены, а ўвесь набытак разрабаваны. Трагізм народнага лёсу асабліва адчувальны ў вершы «Фашысцкаму звяр'ю»: «Зямля ўся пабіта на тысячы ран, / Патоптана дзікай ардою. / У грудах абломкаў ляжаць гарады, / А сёлы – адны папялішчы, / Дзе вецер-вандроўнік пад скогат бяды / У рэбры будыніны свішча» [1, с. 221].

Сярод твораў, дзе паўстае абагулены вобраз народа-змагара, вылучаюцца вершы з рэальнымі вобразамі нацыянальных герояў. Так, у вершы «Бацьку Мінаю» Я. Колас адлюстраваў вобраз легендарнага партызанскага камандзіра «бацькі Мінаям». Фашысцкія захопнікі расстралялі яго сям'ю. Але асабістае гора не зламіла волю гэтага чалавека, і ён з вялікай мужнасцю працягвае змагацца за вызваленне сваёй краіны: «Не хіліцца дуб перад бурай, / І ты не ўмлеў, – / Пазнала нямецкая скура, / Што значыць твой гнеў» [1, с. 232]. У гэтым вершы паэт раскрывае крыніцу гераізму народа-барацьбіта – сапраўдны патрыятызм, высокую свядомасць і самаахвярнасць.

Побач з лірычнымі, пафасна публіцыстычнымі творамі, Колас піша ў ваенныя гады і сатырычныя вершы, палітычныя памфлеты: «Смерць разбойнікам», «Фашысцкім бандытам», «На восі Рым – Берлін», «Крумкачы» і інш. Карыстаючыся дзейснымі сродкамі сатыры, пісьменнік кляйміць чалавеканенавісную сутнасць фашыстаў.

У шэрагу твораў Якуба Коласа ваеннай пары ёсць вершы, у якіх адлюстраваны лёс акупаванай Бацькаўшчыны: «Мая зямля», «Стары гасцінец», «На захад», «Лес», «У цяжкую часіну», «Голас зямлі», «Вясною» і інш. Іх адметнасць у тым, што яны «пазбаўлены публіцыстычнай завостранасці, у іх больш цеплыні, жывых, нацыянальных рэалій. <…> І пейзажная лірыка, дзе Якуб Колас-мастак заўжды адчуваў сябе ўпэўнена, тут паспяхова выкарыстоўваецца, каб у новым ракурсе раскрыць тэму народнай барацьбы» [2, с. 16].

Напрыклад, у вершы «Лес» адсутнічаюць канкрэтныя апісанні партызанскай барацьбы. Але з дапамогай пейзажных замалёвак паэт тонка перадае трывожную напружанасць перад боем у лесе. У Коласа старажытны бор паўстае жывой істотай, змагаром, які дапамагае беларускім партызанам абараняць сваю Айчыну ад ворага : «Не, не спіць, не дрэмле / Старажытны бор: / Ён вартуе землі, / Даўні свой прастор; / З-пад камлёў замшэлых, / З-пад балот, палян / Сочыць вокам смелых / Грозных партызан» [1, с. 190].

Магутную сілу роднай зямлі і народжаных ёю асілкаў-змагароў, якія пераможуць ворага, перадае паэт у вершы «Голас зямлі»: «Зямля мая, мая краіна! / Я чую твой прызыўны звон. / Прымі ж хоць слова твайго сына – / Не доўгі будзе твой палон. / Шумяць гулліва твае пушчы, / Трасуцца помстаю бары, / І дзень твой хмурны змрок расплюшчыць – / Ёсць у цябе багатыры!» [1, с. 209]. У гэтым вершы Якуб Колас узняўся да глыбокіх абагульненняў, ён сам-насам гаворыць з беларускай зямлёй, верыць у яе вызваленне.

Каб надаць вершам больш моцнае сэнсава-змястоўнае гучанне, Якуб Колас істотна абнаўляў вобразна-выяўленчыя сродкі гэтых твораў. Шырока ўжываў азначэнні негатыўна-ацэначнага характару, звязаныя з гістарычнай мінуўшчынай і дзейнасцю агрэсіўных заваёўнікаў : «дзікая арда», «тэўтонская арда», «драпежнікі дзікай арды», «фашысцкая арда», «орды тэўтонцаў», «постаці тэўтонаў» і інш.

Актыўна выкарыстоўваў паэт і фальклорную вобразнасць, элемент фантастычных казак пры апісанні варожых сіл: «фашысцкаму змею тут будзе магіла»; «варожыя раці вампіраў заклятых»; «і курчыцца ў болях прыдушаны змей»; «фашысцкая пачвара»; «У Маскву ўставіўся вампір»; «фашысцкая погань»; «нечысць»; «у вілы іх, як змея, і галавы далоў» і інш.

У вершах Я. Коласа ташкенцкага перыяду шмат прастамоўных выразаў, зніжанай побытавай лексікі, вульгарызмаў, натуралістычных дэталей. Паэт імкнуўся да лексічнай разнастайнасці пры вызначэнні аблічча ворага: «зграя псоў чужых»; «фашысцкі людаед»; «зверы-жываглоты»; «чорны стан атрутны гітлераўскіх зграй»; «чужынец-гад»; «псіна і людажэрца» і інш.

Такім чынам, карыстаючыся дзейснымі мастацкімі сродкамі, пісьменнік выкрываў чалавеканенавісную сутнасць фашызму. У паэзіі Якуба Коласа перыяду Вялікай Айчыннай вайны выразілася вера ў магутныя сілы беларускага народа, усеабдымная любоў да сваёй Радзімы і нянавісць да ворага, усведамленне складанасці барацьбы і ўпэўненасць у перамозе.

## Літаратура

1. *Колас, Я.* Збор твораў : у 12 т. / Я. Колас. – Мінск : Дзяржвыд. БССР, 1961–1964. – Т. 2 : Вершы. 1917–1956. – 1962. – 499 с.
2. *Мушынскі, М. І.* Вобраз вайны ў творах Якуба Коласа 1941–1945 гг. / М. І. Мушынскі // Вялікая Айчынная вайна ў мастацкай літаратуры : матэрыялы Рэсп. навук. канф., Мінск, 27 крас. 2005 г. ; рэдкал. : І. С. Роўда, С. Я. Ганчарова-Грабоўская [і інш.]. – Мінск, 2007. – С. 9–22.


*Е. П. Жиганова (Беларусь)*

# РЕПРЕЗЕНТАЦИЯ ФРАЗЕОЛОГИЧЕСКИХ ЕДИНИЦ С КОМПОНЕНТОМ «ДУША» В СОВРЕМЕННОЙ РУССКОЯЗЫЧНОЙ ПОЭЗИИ БЕЛАРУСИ

Репрезентация национальной картины мира в большей степени осуществляется посредством языка. В свою очередь, языковая картина мира представляет собой устойчивые в повседневном сознании определенного языкового сообщества и отраженные в языке представления об окружающем мире.

Особенно ярко национальный аспект языковой картины мира отражается во фразеологии. Под фразеологической системой языка понимают «выстроенную в сознании упорядоченную совокупность фразеологических представлений о действительности» [1, с. 42]. Фразеологическая картина мира является частью языковой картины мира, причем, картина мира, описанная средствами лексики и фразеологии, представляет собой ядерную основу концептосферы, являющуюся базисом для описания объективной действительности со всеми связями и отношениями в составе высказывания.

Тем интереснее проанализировать культурные тексты, созданные на стыке двух культур, в данном случае – русской и белорусской, и выявить сходства и различия языковых картин мира на фразеологическом уровне.

Исследование проводилось методом сплошной выборки на материале антологии современной русскоязычной поэзии Беларуси «Поэзия русского слова» (в 2 томах) [4]. Корпус материалов составил свыше 350 текстовых включений с компонентом *душа*, из которых более 35 – фразеологические единицы (10 %).

В современном русскоязычном поэтическом дискурсе Беларуси концепт *«душа»* реализуется посредством следующих лексико-семантических моделей: *душа → пространство, душа → человек (люди), душа → нематериальная субстанция, душа → объект воздействия, душа → атрибут живой / неживой природы (вещи), душа → ипостась человеческой личности* [2, с. 136].